V. Vrub. Bibl.

ŠALTINIS
Krynica
Biełaruskaja Narodnaja Hazeta
Vychodzić u aŭtorki i piatnicy.

№ 41 (750).
Cana 10 ct.
VILNIA, 24.V.1940 h.
Hod vydańnia XXII

Padpiska na hod — 5 litaŭ, na paŭhoda — 3 lity.
Zahranicu — ŭdvaja daražej.
Abviestki: za 1 mm u tekście 40 ct., za tekstam 30 ct.

Adresas red.-adm.: Vilnius, Pylimo g-vė 1—2, tel. 28-32
Adres red. i admin.: Vilnia, Zavalnaja vul. 1—2.
Redakcyja i administracyja adčyniena 10—14 hadz.
Redaktar pryjmaje 15—16 hadz.

JUBILEJ BIEŁARUSKAHA PATRYJARCHA FRANCIŠKA BAHUŠEVIČA
(100 — 50 — 40)

Na zary žyćcia biełaruskaha narodu, u X st. chryścijanstva pryniesła jamu piśmienstva, a praz heta kulturu ahułam. Žyvym pravadnikom hetaj kultury na Biełaruś byŭ baŭharski jazyk, viedamy siańnia ŭ nas jak jazyk carkoŭna - slavianski. Jazyk hety dla biełarusaŭ byŭ tady zrazumieły. Ale ŭ mieru raźvićcia i konsolidacyi biełaruskaha narodu tvaryŭsia i paŭstavaŭ žyvy, narodny biełaruski jazyk, a heny carkoŭny abmiraŭ, stavaŭsia narodu mienš zrazumiełym i patrabavaŭ pajaśnieńnia abo i zamieny jaho jazykom narodnym.

Na zachadzie Eŭropy nie-šta padobnaje było tady z jazykom łacinskim. I tam roznyja narody adčuvali patrebu zamieny hetaha abmioršaha jazyka jazykami žyvymi, narodnymi. Užo nieśmiarotny Dante ŭ raspravie „De volgo eloquio" žyvy jazyk staŭlaje vyšej za abmioršuju łacinu. Pahlad hety jahony jašče bolš zamacavaŭ **humanizm**. Pavieŭ humanizmu, jak viedajem, dakaciŭsia i da Biełarusi. Vialikim pradstaŭnikom hetaha humanizmu ŭ nas byŭ dochtar Francišak Skaryna z Połacka, vydaviec biełaruskaj Biblii i inšych knižak u XVI st. Jahonaja vialikaja vydavieckaja praca biełaruskaj narodnaj kultury prakładała darohu i pakazvała kirunak. Hałoŭnaj prykmietaj jahonaj pracy było zbližańnie starasłavianskaha jazyka Biblii da biełaruskaha narodnaha, robiačy papraŭki, pajaśnieńni i dapiski žyvym biełaruskim jazykom.

Nia sudžana adnak było skaryninskim šlacham raźvivacca dalej biełaruskaj kultury. Pryjšli palityčnyja i sacyjalnyja pieraškody, pryjšła unija z Polščaj, a z joj zdrada i renehactva aśviečanych, kulturnych biełaruskich hramadzkich słajoŭ. Pryjšoŭ zaniapad, jaki tryvaŭ praz XVII i XVIII st. Pryjšoŭ zaniapad, ale nia śmierć.



FRANCIŠAK BAHUŠEVIČ

Tak jak u poznym biełaruskim siaredniavieččy skaścianiełyja formy biełaruskaha kulturnaha žyćcia aśviežyŭ i pakiravaŭ na narodny šlach humanizm, pradstaŭnikom jakoha byŭ Francišak Skaryna, tak z hetaha zaniapadu, z kulturnaha zastoju, abudziŭ u XIX st. biełaruski narod i paklikaŭ da žyćcia — **ramantyzm** i jaho najvialikšy biełaruski pradstaŭnik—Francišak B a h u š e v i č. Heta patomak biełaruskaj šlachty, heta spadkajemnik skarynaŭskaj narodnaj biełaruskaj dumki, jakomu było sudžana z iskraŭ Skaryny raspalić vialiki ahoń sučasnaha biełaruskaha nacyjanalnaha adradžeńnia.

Sioleta prypadaje patrojny jubilej Fr. Bahuševiča: 100 hadoŭ ad naradzinaŭ (9.III.1840), 50 hadoŭ ad pryhatavańnia da druku jahonaj słaŭnaj „Biełaruskaj Dudki" (1890) i 40 hadoŭ (15.IV. 1900) ad času jahonaj śmierci. Radziŭsia ŭ Aśmianščynie, u falv. Kušlany, pachavany na parafijalnych mohiłkach ŭ Župranach tut-ža za kaściołam.

Heta byŭ čas, kali mahutnaja rasiejskaja imperyja chaŭturnuju pieśniu piajała biełaruskamu narodu. Heta čas Mikałaja I, Aleksandra II i Aleksandra III. Heta byŭ čas, kali carkva, sud, administracyja, škoła, i ahułam usio žyćcio hramadzkaje, palityčnaje, kulturnaje i ekanamičnaje było jarkim abrazom carskaj niavoli nad biełaruskim narodam. A ŭ kaściele polski nacyjanalizm źviŭ sabie hniazdo i tak-ža dzieiŭ na śmierć biełaruskaha narodu.

Ale nia było sudžana pamierci biełarusam. U popiele zaniapadu i ŭcisku tleli iskry Skaryny, ab jakich pamiataŭ vialiki Fr. Bahuševič, serca jakoha čuła isnavańnie henych iskraŭ. Ciapłom ich hreŭ jon i svajo serca i hety ahoń z serca svajho panios u narod, u serca narodu. I pavoli zaiskrylisia iskry Skaryny ahniom čaradziejnym, pavoli razharelisia ŭ vialiki ahoń, u jasnaje połymia nacyjanalnaha adradžeńnia, jakoha ŭžo ni zdušyć, ni zhasić.

Vialikaja, pryncypovaja, nieśmiarotnaja zasłuha Fr. Bahuševiča ŭ tym, što jon pieršy biełaruskamu narodu pakazaŭ jahony nacyjanalny pryncyp. Biełaruskija litaraturnyja ramantyki spahadali biełarusu ŭ jaho niadoli, biełaruskija ramantyki vučonyja tałkavali ab biełaruskaj minuŭščynie, ab biełaruskaj kultury, biełaruskija ramantyki revalucyjanery: Ihnat Hryniavicki i Kastuś Kalinoŭski žyćcio svajo kłali za lepšy palityčny i sacyjalny byt biełarusa. Ale novy kluč pamysnaści ŭ hetaj baraćbie ŭłažyŭ biełarusu ŭ ruku Fr. Bahuševič, a hetym klučom jość biełaruski n a c y j a n a l n y pryncyp. Sutnaść jaho voś u čym: abudžeńnie śviedamaści ŭ biełaruskich masach rasavaha, etničnaha adzinstva i svajactva, uzbudžeńnie ŭzajemnaj lubovi i lubovi da svajej ziamli, a tak-ža lubovi da svajho jazyka, jak orhanu ŭzajemnaha parazumleńnia i orhanu supolnaha kulturnaha tvorstva i ŭreście, uzbudžeń-

nie ŭ narodzie imknieńniaŭ budavańnia svajho ŭłasnaha domu, svajej nacyjanalnaj dziaržaŭnaści.

Hetaja nacyjanalnaja ideolohija, jakuju ŭliŭ u biełaruski nacyjanalny ruch Fr. Bahuševič — heta pravodnaja ideja, jasnaja zorka na šlachu biełaruskaha narodu siańnia i zaŭtra. Hetym tłumačycca i toj fakt, što ŭ Savieckaj Biełarusi Fr. Bahuševič tak-ža znajšoŭ sabie pryznačeńnie i pašanu. Śviedčać ab hetym tyja akademii, jakija tam u jaho čeść ładziać i tyja mnohija artykuły, jakija pišuć ab im savieckija biełaruskija časapisy.

Tak, Bahuševič u biełaruskim narodzie nieśmiarotny, pamiać ab im u narodzie budzie viečna, a ściežki narodu da Bahuševičavaj mahiły nie zarastuć nikoli.

A. S-ki

U 100-ja ŭhodki naradzinaŭ Francišа Bahuševiča

Ciamnoty mara ŭsiej Krainie
Na vočy kłała svoj chvartuch
I ŭžo čakała toj chviliny,
Kali zaśnie Kryvicki duch.

Skakała viedźmaju niavola,
Kavała ŭ hornie łancuhi.
Mana ŭ Krai znajšła razdolle
I brała ŭsich u abcuhi.

Adzin, druhi ŭžo byŭ zasnuŭ,
Zabyŭsia ŭžo svajho imia,
Ŭvažać za praŭdu staŭ manu,
Nie addzialaŭ ad nočy dnia.

Nia spaŭ, adnak, Kryvicki duch:
Zmahaŭsia z ciemraj i manoj.
Raźbiŭ jon ich uprach-upuch
Nad Kryŭskaj našaj staranoj..

Prajšła zima. Ŭciakli marozy.
Liściom pakrylisia biarozy.
Žyćcio zbudziłasia ad sna —
Na Biełaruś pryjšła viasna...

La vioski byŭ stary kurhan:
Lažali pradziedavy kości.
Na kurhanie rasła viarba —
Tam Franciša ciahnuła štości.
Kali była ŭ jaho žurba,
Kali jamu prychodziŭ sum —
Jon da viarbv išoŭ u hości
I tam jon mieŭ šmat roznych
[dum...

Viasnoj skruciŭ z viarby jon
[dudku
I sieŭ zadumna na kurhan:
Prypomniłaś niavola, pan,
Biaspraŭje, ździeki i pryhon.
Tady dabyŭ jon z dudki ton.

Zajhrała „Dudka Biełaruska"...
Z nietraŭ rodnaj ziamli,
Z rodnych niŭ i lasoŭ,
Z staryny hałasoŭ,
Z-pad stahodniaha snu,
Razarvaŭšy manu,
Pataptaŭšy pryhon,
Vyccam vieča zvon —
Vyjšaŭ dudki ton.

U toj chvilinie
Hołas mahutny
Pa ŭsiej Krainie
Usim byŭ čutny,
Pałoniŭ sercy
Žyćciovym tonam.
Chto ŭ paniaviercy
Hnuŭsia z pakłonam —
Ciapier cior vočy,
Ŭstavaŭ badziora
I byŭ achvočy
Nia znać bolš hora.
Chutka schapiŭsia,
Raźviesialiŭsia,
Druhich huknuje
I zaklikaje:

Kryŭska siamiejka,
Ŭstań – sonca źjaje!
Dudka — žalejka
Čaroŭna hraje.
Ech, što za dudka!
Ŭstavajcie chutka
Pasłuchać hrańnia.
Z samaha rańnia,
Ad sonca ŭschodu,
Ŭsiamu narodu
Jana jość čutka.
Ech, što za dudka!
Ŭstavajcie, ludzi,
Žyćcio nam budzie!.

Tak, jak kaliści
Na vieča zvon,
Iduć pasłuchać
Žalejki ton.
A Franciš mocna
Na dudcy hraje.
Jana da sercaŭ
Tak pramaŭlaje:

Mnoha bied i turbot
Mieŭ naš biedny narod:
Pan, civun i žandar
Byŭ jaho haspadar.
Adrablaŭ jon pryhon
I na panski zahon
Liŭ kryvavy svoj pot.
Cisnuŭ Carski bot.
Ŭ čornych kapturoch
Pryjšli čužyncy,
Zasieli ŭ muroch
Many haduncy;.
Pačali jany
Z kryža karystać,
U movie čužoj
Pacier navučać.
U vočy usim
Puščali tuman.
Mucić pamahaŭ
Dla ich polski pan.
Staraliś trymać
U ciemry narod,
Pačaŭ jon dramać
Iz hoda u hod;
Nia miły jamu
Staŭ rodny jazyk,
Hadziŭsia užo,
što jon cham, mužyk...
Pračchnisia, Kryvič,
Ad doŭhaha snu
Idzi, prahaniaj
Z Krainy manu...
Lud ačuniaŭsia,
Zachvalavaŭsia,
Słuch vysilaje,
A dudka hraje,
I pramaŭlaje:
„Nie pakidajcie
Movy našaj
Biełaruskaj,
Kab nia ŭmiorli"
Nie pakidajcie movy biełaruskaj!-
Niasłosia u prastor
Z paloŭ, łuhoŭ i hor.
Nie pakidajcie movy biełaruskaj!-
Šaptali ŭsie lasy
I nivaŭ kałasy.
Nie pakidajcie movy biełaruskaj!-
Kazała recha z chat,
I čuŭ u sercy brat.
Hetyja słovy zrabili cud:
Ustaŭ sialanski Kryvicki lud.
Many dziaruhu jon skinuŭ z voč
I staŭ jon dumać, jak vyhnać
[proč

BIEŁARUSKI CENTR U LIĆVIE
ŭ niadzielu 26 maja 1940 hodu

ŭ 100-yja ŭhodki naradzinaŭ, u 40-yja ŭhodki śmierci

Franciša Bahuševiča
(Macieja Buračka, Symona Reŭki spad Barysava)

i ŭ 50-yja ŭhodki pryhatavańnia im da druku „Dudki Biełaruskaj"
ładzić

URAČYSTUJU AKADEMIJU

z adpaviednymi referatami, deklamacyjami i pradukcyjami choravymi.

Akademija adbudziecca ŭ zali III-aj Dziaržaŭnaj Himnazii (Daminikanskaja 3, uchod z vulicy).

Pačatak a hadz. 19-aj. Uchod volny i biaspłatny.

Новыя матарыялы да біографіі Фр. Багушэвіча

Францішш Багушэвіч у беларускім адраджэнскім руху адыйграў вялізарную ролю. Ня гледзячы аднак на гэта аб жыцьці яго дагэтуль надта мала што можна было знайсьці ў беларускай літаратуры. Маленькую біографію Фр. Багушэвіча падае ў „Гісторыі Беларускай Літаратуры"М. Гарэцкі, абапёртую на вестках праф. Карскага („Беларусы" т. III),маленькую біографію Багушэвіча падае і Ад. Станкевіч, у сваім даволі абшырным крытычным нарысе „Francіš Bahuševič", выданым у 193) г., маленькія так-жа біографіі Багушэвіча падаюць іншыя беларускія літаратурныя дасьледчыкі, паўтараючы адзін за другім бадай тое самае. Дзеілася гэта дзеля таго, што Фр. Багушэвіч ня меў у сваім жыцьці выдатных таварышаў беларусаў, каторыя маглі-б апісаць ягонае жыцьцё, а таксама і дзеля таго, што сваякі Фр. Багушэвіча, папаўшы пад польскія ўплывы, не дапускалі нікога з беларусаў да тых матарыялаў, якія пакінуў па сабе Багушэвіч і не хацелі даваць аб ягоным жыцьці ніякіх вестак.

Праўда, у працягу апошніх двох год беларускім дасьледчыкам удалося здабыць крыху новага матарыялу аб жыцьці і творчасьці Багушэвіча. Матарыял гэты, зьмешчаны ў „Запісах Беларускага Навуковага Таварыства" (Вільня, 1938). Там знаходзім успаміны аб Багушэвічу ведамага паляка З. Нагродзкага, запісаныя А. Луцкевічам, успаміны украінца Д. Дарашэнкі, а таксама цікавую зацемку Улад. Талочкі аб кантактах Багушэвіча з ведамай пісьменьніцай Э.Арэшчыхай. Цікавыя, дасюль нідзе неапублікаваныя матарыялы надрукаваў сёлета ў № 9 (465) „Літаратуры і Мастацтва" (Менск, 23.III.1940) І. Кузьмін, аб уступленьні і выступленьні Фр. Багушэвіча з Пецярбурскага унівэрсытэту, апёртыя на гістарычным архіве Пецярбурскага унівэрсытэту, дзе знойдзена справа Фр. Багушэвіча. Цяпер, пасьля далучэньня Заходняе Беларусі да БССР, зьмянілі свае адносіны да беларусаў і сваякі Багушэвіча, каторыя жывуць у Ашмяншчыне, і каторыя аддалі літаратурнай брыгадзе, якая арганізавала ў Ашмяншчыне сьвяткаваньні ў чэсьць сёлетняга юбілею Багушэвіча, дзесяць фатаграфіяў з жыцьця пісьменьніка, што адносяцца да розных пэрыядаў ягонага жыцьця, зарысоўку „Ф. К. Багушэвіч у дзень сьмерці," зробленую рукой сына Багушэвіча і маленькі літаратурны сатырычны твор у рукапісе п. н. „Сьвіньні і бараны," які зьяўляецца або арыгінальным творам нашага пісьменьніка, або перакладам. Думаем, што літ. брыгада атрымала і некаторыя весткі аб жыцьці Багушэвіча, дасюль шырэй няведамыя і што гэтыя весткі паявяцца ў друку.

Усе пералічаныя вышэй артыкулы, успаміны, фатаграфіі зьяўляюцца, бязумоўна, удзячным матарыялам для беларускіх навукоўцаў дзеля апрацаваньня шырокае біографіі Фр. Багушэвіча, што ўжо даўно трэба было зрабіць. Перагледзеўшы ўсе гэныя матарыялы, біографія Фр. Багушэвіча ў кароткім папулярным нарысе выглядае гэтак:

Францішш Багушэвіч радзіўся 9 сакавіка 1840 году, у небагатай сям'і дробнага спольшчанага беларускага шляхціца каталіка Казімера Багушэвіча, у фальварку Кушляны ў Ашмяншчыне. Сярэднюю асьвету атрымаў у Віленскай губэрскай гімназіі, па атэстаце з якой, выданым яму 2/.VI.1861 году № 1097, быў прыняты 15.IX.1861 г. бяз экзамінаў

Niavolu, ciemru, naśmieški, ździek
Jakimi złydni karmili viek.

Paśla Franciš zrabiŭ i „Smyk,“
Ludziom pa sercach paciahnuŭ-
Nichto ŭžo bolej nie zasnuŭ:
Ŭ dušach sialan pačuŭsia kryk:
Ŭstavaj pakryŭdžany mužyk!

I voś, paśla pryjšła para,
Kali na pana i cara
Padniaŭsia zbrojna ŭvieś narod
Ŭ dzieviaćsoty piaty hod...

Žyćcio za spravu na aŭtar
Davaŭ ziamielki haspadar.
Za Kraj svoj rodny, baraznu,
Kab razahnać usiu manu,
Padniaŭ svoj ściah vyšej, da zor...

Za mocny byŭ adnak adpor...
Zapanavała znoŭ mana,
Iznoŭ u putach Starana,
Iznoŭ mahiły-kurhany...
I cisnuŭ car, a z im pany...

. . . .

Tysiača dzieviaćsot
Čatyrnaccaty hod...
Kryvaviŭ znoŭ narod.
Płakali dzievańki
Małajcoŭ vypraŭlajučy
Za čužych zmahacisia,
Słavaj abdarajučy,
Vorahaŭ zmahajučy —
Z žyćciom rasstavacisia...

Ad hromaŭ harmatnich ziamla ŭsia stahnała,
Kryvi čałaviečaj pryjmać nie ŭśpiavała.
Niavinnaha ludu ŭ prymusie miljony
Za spravu tyranaŭ išli ŭ boj šalony...
Ale paśla i car ŭžo źnik.

Narod adčuŭ u sercy „Smyk:“
Z hrudziej jak hrom razdaŭsia kryk:
Ŭstavaj, ustavaj, chto śpić ŭ niavoli,
Za złydniaŭ spravu ŭžo davoli
Biazmetna jści na źništažeńnie,
Svajho nam treba vyzvaleńnia!
Dałoŭ caroŭ, dałoŭ ich puty!
Žbirajcieś ŭsie, chto jość zakuty
Ŭ łancuch niavoli toj haniebny,
Dałoŭ!—cary nam nie patrebny!

Para zmahacca za svabodu! —
Razdaŭsia klič usich narodaŭ...

. . . .

Tysiača dzieviaćsot
vosiemnaccaty hod...
Išoŭ narod
Na vialiki schod,
Volaj praniaty.
Sakavik dvaccać piaty...
Radaść — biaźmierna:
Biełaruś — Niezaležna!...

. . . .

Paśla...
Znoŭ budzień...
Pieršaje — studzień...
B. S. S. R..
Čužy žaŭnier...
Razrez biaz naža —
Ryskaja miaža...

. . . .

Arłoŭ biełych miacielica
Plavała śnieham ŭ tvar Pahoni;
Maroz niasła ŭ asieliśča,
Imhłoju kryła nivaŭ honi.
Piaščanymi paletkami,
Vuzieńkimi zahonami,
Čužych „kultur“ abjedkami,
Carkvy - kaściołaŭ zvonami —
Na Kryviju udaryła —
Manoj zahaspadaryła.

Biel hienerała ščupała chaty,
Lezła na ścieny, peckała łaty,
Panad Krainaj maraj snavała,
Usim pracoŭnym strach nadavała
Panoŭ i šlachtu brała ŭ achovu,
Zhłumić chacieła našuju movu.

Ale sialanska kožnaja strecha
Słaŭnaje „Dudki“ davała recha.
Jana iz viosak krepaść tvaryła,
Narod Kryvicki siłaj daryła...

. . . .

Tysiača dzieviaćsot
Tryccać dzieviaty hod...
Iznoŭ pachod...
Biel hienerałaŭ--raźbita ŭ puch.
Vyšej padniaŭsia svabody duch.
Ŭ novy peryjad ŭvajšoŭ narod.
Budź-ža badziory, Kryvicki rod!
A „Dudki“ słaŭnaj mahutny ton
Chaj bje u sercy tabie, jak zvon.

Uł. Kazłoŭščyk

Pramova Prezydenta ab rabotnickich spravach

18 h. m. Prezydent Respubliki A. Smetona, u časie adčynieńnia budynku Pałaty Pracy skazaŭ pramovu, u jakoj hałoŭnuju ŭvahu źviarnuŭ na rabotnickija spravy.

Prezydent Respubliki, padčyrknuŭšy imknieńni kožnaha čałavieka da stvareńnia sabie svaje ŭłasnaje chaty, a tak-ža imknieńnie rabotnika da samastojnaha žyćcia, da stvareńnia svajho ŭłasnaha varštatu pracy, źviarnuŭ uvahu na jakaść vykonvańnia daručanaj rabotniku pracy, ad čaho zaležyć nia tolki raźvićcio ekanamičnaha žyćcia, ale i dabro haspadarstva-dziaržavy. Dziela taho rabotnik, jak i kožny inšy čałaviek pracy, katory, na dumku Prezydenta, moža tak-ža nazyvacca rabotnikam, pavinien vučycca pracavać i zdabyvać sabie što raz bolšuju aśvietu. Ŭ hetym rabotnikam pamahaje haspadarstva praz Pałaty: Pracy, Ramiasła, Ziemlarobstva, Promysłu i Handlu a tak-ža roznyja hramadzkija arhanizacyi. Haspadarstva taksama dbaje, kab rabotnik nia byŭ ekspłoatavany i kab pradpryjemstvy nia byli rujnavanyja. Praca nia jość metaj tolki pražyćcia, a jość jana i sposabam da asiahnieńnia vyšejšych metaŭ, jakimi jość vartaści niahinučyja, duchovyja, što prajaŭlajucca ŭ navucy, mastactvie i relihii. Tvory mastakoŭ praznačany nia tolki dla vybranych adzinak, ale i dla masaŭ, ludziej zvyčajnych, prostych, katoryja tak-ža pryhožaść umiejuć adčuć i katoryja ŭzbahačvajuć mastactva, tvoračy narodnuju paeziju, pieśniu, baśni, vyrazajučy z dreva roznyja pryhožyja fihury, tkučy pryhožyja tkaniny. Čałaviek pracy, zmučany, abiassileny patrabuje kulturnaje razryŭki i adpačynku. Nia hrecham źjaŭlajecca dla rabotnika i sport, kultura cieła. Hrecham adnak jość pjanstva i rasstrata ciažka zaroblenych hrošaŭ. Heta hrech pierad samym saboj, pierad svajej siamjoj i pierad svaim narodam. Dobry rabotnik byŭ i budzie dobra vykonvać svaju pracu, budzie vučycca i zachoplivacca mastactvam, zajmacca sportam i himnastykaj u svabodnym časie i nie paddasca pakusam niakulturnych razryvak. Pałacie Pracy žadajecca, kab jaje značeńnie što raz bolš uzrastała, kab jana budavała novyja svaje damy, bo ad rabotnikaŭ, ad ich sumlennaści, umiełaści i śviedamaj pracy zaležyć i ščaślivaja budučynia Litvy.

Biełaruskaja chronika

Pasiedžańnie Centralnaha Ŭradu Biełaruskaha Centru. Ŭ niadzielu 19 h. m. u Vilni adbyłosia pasiedžańnie Centralnaha Ŭradu Biełaruskaha Centru ŭ Lićvie, na jakim byŭ abhavorany plan dziejnaści na najbližejšuju budučyniu hetaj arhanizacyi.

Biełaruskaja radyjo-pieradača z Vilenskaha Radyjofonu ŭ biahučym tydni adbudziecca u subotu 25.V ad hadziny 16.15 da hadziny 16.30, a nie ŭ čaćvier, jak było raniej namiečana.

Ŭ 1-šyja ŭhodki śmierci D-r M. Hołub-Bučynskaj. Starańniem kruhu znajomych u najbližejšuju sieradu 29 h. m., u 1-šyja uhodki śmierci D-r M. Hołub-Bučynskaj, za spakoj jejnaj dušy, adbudziecca nabažeństva ŭ kaściele śv. Baŭtramieja ŭ Vilni, na Zareččy, a hadz. 7-aj naranicy.

Z Savieckaj Biełarusi

XVIII źjezd Kamunistyčnaje Partyi Biełarusi. 15 h. m. u Miensku pačaŭsia XVIII źjezd Kamunistyčnaje Partyi Biełarusi. Šyrej ab im napišam u nastupnym numary „Krynicy“.

у Імпэратарскі Пецярбурскі Унівэрсытэт на фізыка-матэматычны факультэт, разр. матэматычных навук, на I курс. 13.XI.1861 г. Багушэвіч падаў рэктару просьбу, у якой ён, паклікаючыся на тое, што ягонае здароўе ня можа пераносьці пецярбурскага клімату, па парадзе лекара павінен вярнуцца на сваю бацькаўшчыну і дзеля таго просіць выдаць усе ягоныя дакуманты. 16.XI. кіраўніцтва унівэрсытэту пастанавіла уважаць Багушэвіча звольненым з унівэрсытэту, а 17.XI.1861 г. Багушэвіч паквітаваў у актах, што дакуманты свае часткава атрымаў. Фактычная аднак прычына выезду Багушэвіча з Пецярбургу была іншая. У гэтым часе, калі ён быў у унівэрсытэце, у Пецярбурзе адбываліся студэнцкія забурэньні супроць царскіх новых закочаў аб працы ў унівэрсытэтах. У забурэньнях гэтых прыймаў, відаць, удзел і Багушэвіч, бо хоць ён ня быў у сьпіску пацярпеўшых студэнтаў, але частку ягоных дакумантаў, за месяц да яго звальненьня, унівэрсытэт пераслаў Обэр-паліцмэйстру, каторы вёў сьледзтва і шукаў вінаватых у справе забурэньняў. Багушэвіч аднак упару ўцёк, прабыўшы у Пецярбурзе два месяцы.

Вярнуўшыся з Пецярбургу Багушэвіч быў нейкі час вучыцелем у Доцішках, а ў 1863 годзе прыймаў дзейнае ўчасьце ў паўстаньні супроць Расеі, аб чым пасьля расказваў Д. Дарашэнцы. Магчыма, што Фр. Багушэвіч быў у кантакце з слаўным К. Каліноўскім — дыктатарам паўстаньня ў Беларусі і Ліцьве, тымбольш, што пагляды іх былі ў гэны час бадай аднолькавыя і абшар дзейнасьці бадай той самы. К. Каліноўскі быў у Вільні, а Багушэвіч ў Ашмяншчыне. У часе паўстаньня Багушэвіч быў ранены ў нагу і астаўся жывым дзякуючы толькі таму, што ім заапекаваліся беларускія сяляне. Учасьце ў паўстаньні прымусіла яго заціраць за сабой сьляды прад царскай уладай і ён выехаў на Украіну ў Нежын, дзе вучыўся і скончыў у 1868 годзе Юрыдычны Ліцэй. Пасьля жыў і працаваў у Канатопе (на Украіне), як сьледчы судзьдзя. Там ён ажаніўся з Габрыеляй Шкленьнічанкай, родам з Менску і там, пад уплывам твораў украінскіх паэтаў, пачаў пісаць вершы, спачатку паукраінску, а пасьля пабеларуску. Усе украінскія вершы паэт зьністожыў як нічога ня вартыя.

У канцы 80-х гадоў Багушэвіч пераехаў у Вільню і тут працаваў аж да 1898 году як адвакат. У Вільні жыў Багушэвіч сваім жыцьцём, не ўваходзіў бадай з нікім з мяшчан у бліжэйшы асабісты кантакт. Справы адвакацкія браў выключна ад сялян, з якімі цесна зьвязваўся. Не зважаючы на сваю адасобленасьць у таварыскім жыцьці, Багушэвіч кантактаваўся з радыкальнымі элемэнтамі ў краі і заграніцай, а нават выступаў на вечарох, чытаючы свае беларускія вершы. Карэспандаваў ён і асабіста ў 1888 і 1893 г. адведаў у Горадні польскую пісьменьніцу, Э. Арэшчыху, каторая паходзіла з нашага краю і прыгожа яго апісвала. Дзякуючы кантактам з заграніцай, у 1891 годзе ў Кракаве выйшаў першы зборнік вершаў Фр. Багушэвіча „Дудка беларуская“ з слаўнай прадмовай, падпісанай псэўданімам Мацей Бурачок, а ў 1894 г. выйшаў у Пазнані другі зборнік Багушэвіча п. н. „Беларускі смык,“ падпісаны псэўданімам Сымон Рэўка з-пад Бэрысава. У Вільні пасьля 1893 г. Багушэвіч падружыў з З. Нагродзкім, каторы працаваў у коопаратыве і памагаў распаўсюджваць „Дудку“ і „Смык“ сярод сялян. Багушэвіч спатыкаўся ў Віль-

Što čuvać na frontach i ŭ palitycy

Pachod niemcaŭ na Zachadzie niastrymana pasoŭvajecca napierad. Adnej hrupie zmotaryzavanych *niamieckich addziełaŭ udałosia zusim raźbić 9 francuskuju armiju,* uziać vialikuju kolkaść francuskaha vojska ŭ pałon z jejnym štabam, na čale jakoha stajaŭ słaŭny francuski hienerał Giraud. Paśla raźbićcia 9 armii, henyja-ž niamieckija addziely, biaz bolšych pieraškod *dajšli da kanału La Manche i zabrali francuskaje partovaje miesta Abbeville.* Takim čynam niemcam udałosia raździalić siły sajuźnikaŭ na dźvie čaści, i tuju častku, katoraja znachodzicca na niezaniatych niemcami belhickich abšarach akružyć. Krepaści Namur i Liege, jakija doŭha baranilisia, užo paddalisia. Druhaja-ž hrupa zmotaryzavanych niamieckich addziełaŭ, skiravanaja na Paryž, taksama pasoŭvajecca napierad i ŭžo da Paryža joj astałosia tolki 75 klm. U Francyi panuje tryvožny nastroj i možna skazać chaos, dziakujučy jakomu i papaŭ u pałon hien Giraud. Sam premjer Reynaud, havoračy ab pałažeńni Francyi i ab mahčymaści abarony, zajaviŭ, što kali-b ludzi kazali, što treba cudaŭ na ratavańnie Francyi, skazaŭ-by: „Vieru ŭ cudy, bo vieru ŭ Francyju". Hien. Weygand usimi sposabami starajecca ratavać Francyju i strymać pachod niemcaŭ. Jon vydaŭ zahad kontrnastupleńnia na niemcaŭ na ŭsim froncie. Pakulšto adnak addziełam sajuźnikaŭ, akružanym u Belhii, udałosia adabrać tolki adno miesta Arras. Henyja addziely znachodziacca ŭ ciažkim pałažeńni, bo pomač jany mohuć dastać tolki z Anhlii praz mora. I dziela taho jany ŭsimi siłami chočuć prarvać niamiecki łancuh i złučycca z usiej francuskaj armijaj. Hien. Weygand zajaviŭ pradstaŭnikom presy, što hałoŭnym jahonym imknieńniem jość vytrymać adzin miesiac, kali heta ŭdasca, dyk try čaćviortyja darohi da pieramohi buduć za nami. Adnačasna ŭ Francyi viadziecca čystka ŭ nutry. Vykryta tam vialikaja špijonskaja arhanizacyja, jakaja raskidała ŭlotki da žaŭnieraŭ, zaklikajučy kidać aružža, a navat praz hałoŭny francuski štab dała zahad vojsku nia zryvać mastoŭ, pa jakich biaz nijakich pieraškod prachodzili paśla niamieckija siły.

U Anhlii ŭściaž spadziajucca niamieckaj ataki, dla jakoj niemcy, zaniaŭšy častku francuskaha ŭźbiarežža kanału La Manche, majuć nadta vyhadnuju pazycyju. Dziela taho anhlickija samaloty ŭściaž bambardujuć roznyja niamieckija miesty i čyhunki, kab strymać da stavu bolšaje kolkaści niamieckaha vojska i kab źništožyć składy benzyny i takim čynam strymać ataki zmotaryzavanych niamieckich addziełaŭ na francuskim froncie. Anhlicki parlamant, bačačy ciažkaje pałažeńnie, pryznaŭ uradu nadzvyčajnyja paŭnamoctvy, kab tolki akcyja jahonaja mahła być bolš aktyŭnaj.

Italija dalej zachoŭvajecca nie vyrazna, nie vyjaŭlajučy svajho akančalnaha stanovišča, adnak hrupuje svajo vojska na juhasłavianskaj hranicy.

U spravie Bałkanaŭ sensacyjaj źjaŭlajecca, što *SSSR zahvarantavaŭ niezaležnaść Juhasłavii i što ŭžo savieckaje vojska zhrupavana na hranicy Madziarščyny, jakoje hatova pamahać Juhasłavii.*

Złučanyja Štaty Pnč. Ameryki tak-ža ničoha novaha nia vyjavili, kali nia ličyć taho, što pastanavili jany dastavić u najbližejšym časie Anhlii i Francyi bolšuju kolkaść aružža, amunicyi i samalotaŭ.

U pałažeńni *Narvehii i na Dalokim Uschodzie* bolšych źmienaŭ nia vidać. *Rep.*

Baćki biełarusy zapisvajcie svaich dziaciej ŭ biełaruskija škoły!

Školnyja ŭłady vydali zahad, na asnovie jakoha ŭsie dzieci ŭ Vilni, u vieku ad 7 da 14 hod pavinny być zapisany ŭ pačatkavyja škoły. Zapisy buduć tryvać kožny dzień ad 24 maja da 4 červienia 1940 hodu. Kožny baćka biełarus pavinien zapisvać svajo dzicia ŭ biełaruskuju dziaržaŭnuju pačatkavuju školu ŭ Vilni № 55, jakaja mieścicca pry Daminikanskaj vulicy № 3/5 (uchod z panadvorka). Tam-ža pryjmajucca ŭžo zapisy vučniaŭ, katoryja skončyli 6 addziełaŭ pač. škoły, u Biełaruskuju Prohimnaziju. Zapisy dziaciej uva ŭsie addziely pačatkavaje škoły pryjmajucca štodzień ad hadz. 8 da 14-taj. Biełarus, zapisvajučy svajo dzicia ŭ biełaruskuju školu, ablahčaje jamu zdabyvańnie aśviety, a tak-ža spaŭniaje svoj biełaruski nacyjanalny abaviazak. Aśvieta ŭ rodnaj movie, u rodnaj svajej škole jość najdastupniejšaj. Biełaruskaja škoła vučyć dziaciej hramaty pabiełarusku, a tak-ža vučyć litoŭskaha jazyka. U biełaruskaj škole dzieci vučacca čytać i pisać litarami łacinskimi (polskimi), a taksama i litarami hraždanki (ruskimi). U biełaruskaj škole, biełaruskaj moładździu apiakujucca nia tolki baćki, ale i ŭsio biełaruskaje hramadzianstva, arhanizujučy kožny dzień dla patrabujučych dziaciej śniedańni i pomač adziežaj i abutkam. Kožny baćka biełarus, jaki dabra žadaje svajmu dziciaci, pavinien jaho vučyć u biełaruskaj škole.

Dyk usie baćki, biełarusy vilenčuki, zapisvajcie svaich dziaciej vučycca ŭ biełaruskuju pačatkavuju školu ŭ Vilni № 55 i biełaruskuju Prohimnaziju!

Życcio u Vilni i Kraju

Nielehalnyja adozvy ŭ Vilni pajavilisia, jak padaje „Lietuvos Aidas", drukavanyja palitoŭsku i padpisanyja pastupovaj hrupaj studentaŭ Vilenskaha Universytetu. U adozvie atakujecca ŭrad, studenty šaŭlisy i studenckija korporacyi. U spravie hetaje adozvy palicyja viadzie śledztva, kab vykryć inicyjataraŭ jaje.

Rektar Biržyška vydaŭ adozvu da studenckaje moładzi, u jakoj zaklikaje da šanavańnia paradku i nieadychodžańnia ad ahulnaha kirunku litoŭskaje palityki jak zahraničnaje, tak i ŭnutranaje. Rektar vostra hanić tak-ža roznyja falšyvyja płotki i niekatoryja studenckija publičnyja vystupleńni. 16 h. m. Senat Vilenskaha Universytetu stvaryŭ Dyscyplinarny Sud, jaki budzie sudzić studentaŭ za ich niadobryja pastupki. Chto sam siabie nie pakliča da paradku — havorycca ŭ adozvie Rektara—taho pakličuć inšyja.

Zborka žaleza-łomu arhanizujecca ŭ Lićvie ad 15.V da 1.IX dziela ŭzmacnieńnia armii.

Saviecki i niamiecki konsulaty buduć chutka stvorany ŭ Vilni.

Zachvareŭ rektar Vilenskaha Universytetu praf. M. Biržyška. Z hetaje pryčyny abaviazki rektara spaŭniaje prorektar praf. P. Šalčius.

Relihijny muzej u Vilni arhanizuje malar Valeška.

ні з польскімі дэмакратамі, але адносіўся да іх вельмі крытычна і востра кляйміў іх за нястачу ў іх сапраўднага дэмакратызму, ды за іншыя агульна-ведамыя заганы палякоў.

У 1898 г. у 100-я ўгодкі нарадзінаў А. Міцкевіча, у кватэры Багушэвіча адбыўся сход і сарганізаваўся камітэт дзеля адсьвяткаваньня гэтага юбілею і дзеля пастаўленьня ў касьцеле сьв. Яна адпаведнага памятніка. У камітэт быў выбраны і Багушэвіч, але пасьля выступіў, бо граф Тышкевіч пачаў неадпаведным спосабам зьбіраць грошы на памятнік А. Міцкевічу. Багушэвіч гэта востра скрытыкаваў у спэцыяльным вершы, напісаным папольску. Апрача таго Багушэвіч напісаў папольску некалькі вершыкаў у альбом М. Пятравічанкі і адну песеньку.

На гэтай бадай падставе ў „Запісах Бел. Нав. Т-ва", у артыкуле „Жыцьцё і творства Фр. Багушэвіча ў успамінах ягоных сучасьнікаў", апёртага на ўспаміне п а л я к а, праяўляецца імкненьне да паменшаньня таго вялікага значэньня Фр. Багушэвіча, якое яму прызнаюць усе іншыя бел. літаратурныя і гістарычныя дасьледчыкі, як Гарэцкі, Піотуховіч, Цьвікевіч, Ігнатоўскі, Ад. Станкевіч і ўся бел. нацыянальная і камуністычная прэса. У сапраўднасьці гэныя вершыкі ніякага большага значэньня ня маюць, а што палякі кожнага выдатнага чалавека з нашага краю хочуць бачыць польскім патрыётам, гэта ўсім ведама і зразумела, і гэта ніякага значэньня, ані ніякага мінусу для Багушэвіча не прадстаўляе і яго зусім правільна называюць бацькам беларускага адраджэнскага руху, бацькам самастойнае беларускае назалежніцкае думкі.

Як чалавек, Багушэвіч быў шляхотны, уражлівы, высака моральны, а як паэта так-жа праявіў вялікі талент.

Памёр Фр. Багушэвіч 15.IV. 1900 г. у родных Кушлянах, куды пераехаў з Вільні пасьля 1898 г. Да сьмерці яго многа прычынілася экскурсія з 1897 г. у Коўна, у часе якое Багушэвіч, начуючы пад адкрытым небам, моцна прастудзіўся і ад таго часу хварэў аж да сьмерці. Прад сьмерцяй Багушэвіч заняўся яшчэ працай над укладаньнем беларускага слоўніка, у друку аднак з яе ніхто не карыстаў. Не надрукаваныя дасюль яшчэ нідзе зборнікі вершаў Багушэвіча: „Тралялёначка", які няведама дзе знаходзіцца, а так-жа „Беларуская скрыпачка", якая была ў архіве праф. Б. Эпімах-Шыпілы. Некаторыя творы Багушэвіча — вершы і апавяданьні — распаўсюджваныя былі ў рукапісах, або, як „Баран і сьвіньні", друкаваныя ў бел. часапісах „Дудка" і „Смык" дасюль былі ўжо перавыданы некалькі разоў, па некалькі тысяч экзэмпляраў, якія шырака расходзіліся сярод беларускага народу.

Сьмерць Багушэвіча моцна адчула мясцовае беларускае сялянства ў Ашмяншчыне, якое яго знала, як свайго прыяцеля. Адчулі яе людзі працы і ў Вільні, каторыя на паховіны Багушэвіча выслалі спэцыяльную дэлегацыю з вянком з беларускім напісам.

Фр. Багушэвіч памёр, але памёр толькі целам, а дух ягоны і ягоныя творы жывуць і далей будуць жыць. Яны заклікаюць беларускі народ да працы на ніве беларускай, да адраджэньня, да лепшае долі. Заціхне іграньне „Дудкі", як кажа сам Фр. Багушэвіч тады, як сьлязы ня стане. Але і тады памяць аб ім і ўдзячнасьць яму беларусаў будзе вялікая.

Я. Найдзюк

Leidėjas ir Redaktorius: ADOLFAS KLIMOVIČIUS
Vydaviec i Redaktar: ADOLF KLIMOVIČ
Telefon u drukarniu i redakcyju 28-32.
Fr. Skarynos vardo Gudų Spaustuvė, Vilnius, Pylimo g-vė 1
Biel. Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, vul. Zavalnaja 1.